# УЗНІКНЕННЕ ВЫШЭЙШАЙ ПЕДАГАГІЧНАЙ АДУКАЦЫІ БЕЛАРУСІ Ў ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ. ПА МАТЭРЫЯЛАХ МАГІЛЁЎСКАГА ПЕДАГАГІЧНАГА ІНСТЫТУТА

*А. Агееў*
*(Магілёў, МагДУ)*

Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова вядзе свой радавод ад Магілёўскага настаўніцкага інстытута, які распачаў сваю дзейнасць у далёкім 1913 годзе. У пачатку XX стагоддзя ў беларускіх губернях назіраўся значны недахоп кваліфікаваных настаўнікаў, які быў выкліканы хуткім пашырэннем сеткі пачатковых школ і слабаразвітай сістэмай падрыхтоўкі педагагічных кадраў. Віленскі настаўніцкі інстытут не мог забяспечыць патрэбы краю. Трэба адзначыць, што пэўная сістэма падрыхтоўкі настаўніцкіх кадраў існавала. У 1905 г. у Беларусі было 4 настаўніцкія семінарыі з колькасцю навучэнцаў 515 чалавек у асноўных класах. Аднагадовых курсаў пры гарадскіх вучылішчах у гэты час было 5 з 50 навучэнцамі. У 1908 г. іх пераўтварылі ў двухгадовыя.

У 1909 г. паміж Віцебскам і Магілёвам пачалося спаборніцтва за права адкрыцця настаўніцкі інстытут. У выніку ў 1910 г. перамог Віцебск. Магілёўскія губернскія і гарадскія ўлады не змірыліся з няўдачай. Тое, што не ўдалося зрабіць у 1910 г., здзейснілася праз 3 гады. Летам 1913 г. было канчаткова вырашана адкрыць 1 ліпеня 1913 г. у г. Магілёве настаўніцкі інстытут «з гарадскім пры ім вучылішчам». Урачыстае адкрыццё інстытута адбылося 1 кастрычніка 1913 г. Цікавай у гісторыі станаўлення інстытута была спроба найменавання яго «Раманаўскім». Правілы паступлення, пералік уступных экзаменаў і іх праграм зацвердзілі па ўзоры Віленскага хрысціянскага, Маскоўскага і Віцебскага настаўніцкіх інстытутаў. У інстытут прымаліся асобы мужчынскага полу праваслаўнага веравызнання ад 16 да 25 гадоў. Для яўрэяў з 1875 г. у Вільне існаваў спецыяльны яўрэйскі настаўніцкі інстытут.

Быў распрацаваны неблагі праект будынка інстытута, які Міністэрства зацвердзіла ў сакавіку 1914 года, але неўзабаве пачалася Першая сусветная вайна і яго будаўніцтва засталося на паперы. У гады вайны інстытут меў цяжкасці з наборам студэнтаў і памяшканнем. Частка студэнтаў і выкладчыкаў была мабілізавана на фронт. Пасля пераводу Стаўкі Вярхоўнага галоўнакамандуючага ў Магілёў летам 1915 г. большая частка будынка інстытута была занята рознымі вайсковымі і дыпламатычнымі ўстановамі і часцямі.

У жніўні 1914 г. папячыцелем акругі быў вызвалены ад выкладання гімнастыкі Ф. Стангль. Прычыны гэтага здарэння былі ўжо не ўнутранымі, а міжнароднымі. Стангль быў адхілены ад выкладання па этнічных і рэлігійных прычынах. Не дапамагалі нават бліскучыя характарыстыкі з вучэбных устаноў, дзе выкладчык раней працаваў. Толькі пасля прыняцця Станглем рускага падданства ў лістападзе 1914 г. яму было дазволена прыступіць з 1 студзеня 1915 г. да ўрокаў. [3, арк. 8 – 11] Настаўнік гарадскога пры інстытуце вучылішча Я. Жыхараў быў узнагароджаны срэбным медалём з надпісам «За усердие». [2, арк. 11]

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Першы выпуск інстытута адбыўся ў 1916 г., калі 33 выхаванцы атрымалі званне настаўніка вышэйшага пачатковага вучылішча. Інстытут падрыхтаваў, па дадзеных В. Бандарэнкі, больш за 100 кваліфікаваных настаўнікаў. [1, с. 7] Аднак ў журнале выходнай дакументацыі ў пачатку 1919 г. зафіксавана выдача атэстатаў аб заканчэнні курсаў Магілёўскага настаўніцкага інстытута дзевяці асобам, над прозвішчамі якіх зверху прастаўлены парадкавыя нумары ад 293-га да 301-га. [4, арк. 1-25, 131]

Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917г. дырэктар У.М. Тычынін накіроўвае шматлікія просьбы і патрабаванні ў вышэйшыя вайсковыя ўстановы аб вызваленні ад воінскага пастою памяшкання інстытута. Рэвалюцыя прывяла да вялізных ператварэнняў ва ўсіх сферах грамадства. Ужо ўлетку 1917 г. Часовы ўрад прыступіў да ліквідацыі нацыянальных, рэлігійных, сацыяльных абмежаванняў у вобласці адукацыі, у тым ліку дазволіў прымаць у навучальныя ўстановы асоб абоега полу. Пасля кастрычніцкай рэвалюцыі набор 1917 г. ішоў па адпрацаванай схеме. Напачатку 1918 г. (у сувязі з дэмабілізацыяй расійскай арміі) у інстытут пачалі паступаць прашэнні ад былых выхаванцаў, якія былі ў свой час прызваны ў армію, аб прыняцці іх у лік слухачоў. У студзені 1918 г. заняткі ў інстытуце аднавіліся.

У сакавіку 1918 г. горад Магілёў быў заняты польскімі войскамі, а ў маі – германскімі ўзброенымі фарміраваннямі. Нягледзячы на прынятыя ў савецкі час меркаванні, дзейнасць настаўніцкага інстытута ва ўмовах акупацыі не прыпынілася. Адміністрацыя інстытута цяпер прасіла дазволы і ўзгадняла свае рашэнні з новымі ўладамі. У сакавіку У. Тычынін прасіў грошай на ўтрыманне інстытута ў начальніка забеспячэння і фінансаў польскага корпуса. Вырашаліся і іншыя шматлікія гаспадарчыя і вучэбныя пытанні. Ва ўпраўленне Віленскай вучэбнай акругі дасылаліся просьбы па «абмежаванні інстытута» ад неадпаведных яму і непасільных павіннасцяў і патрабаванняў з боку «акупацыйных і міліцыйных уладаў». Выкладчыкі і студэнты атрымлівалі пасведчанні, якія дазвалялі ва ўмовах ваеннага становішча пражываць на акупаванай тэрыторыі, ездзіць па харчаванне ў вёску і г.д. Кіраўніцтва інстытута кансультавалася, ці можна прымаць яўрэяў у праваслаўны настаўніцкі інстытут.

У жніўні-верасні 1918 г. арганізавана прайшло чарговае залічэнне слухачоў і 17-га верасня навучэнцы запрашаліся на заняткі. Пасля ўступлення ў Магілёў 31 кастрычніка 1918 г. войск Чырвонай Арміі і пераходу ўлады да губернскага рэвалюцыйнага камітэта дзейнасць інстытута каардынавалася ўжо з савецкімі органамі ўлады.

У адпаведнасці з пастановай Усерасійскага з'езда работнікаў настаўніцкіх інстытутаў напрыканцы 1918 года Магілёўскі настаўніцкі інстытут быў пераўтвораны ў педагагічны – вышэйшую навучальную ўстанову з чатырохгадовым тэрмінам навучання. У склад яе супрацоўнікаў увайшлі лепшыя выкладчыкі навучальных устаноў горада Магілёва, а таксама былі запрошаны спецыялісты з розных гарадоў Расіі. Інстытут меў 3 аддзяленні і рыхтаваў настаўнікаў школ першай і другой ступені, а таксама работнікаў дашкольных устаноў.

У 1919 г. у Маскве было прынята рашэнне аб чарговай рэарганізацыі: педагагічныя інстытуты пераўтвараліся ў інстытуты народнай адукацыі з аддзеламі: 1) дашкольным, 2) па падрыхтоўцы выкладчыкаў для школ I ступені, 3) па падрыхтоўцы выкладчыкаў для школ II ступені, 4) пазашкольным, 5) па падрыхтоўцы інструктараў працоўных працэсаў. У адпаведнасці са статутам яны адносіліся да вышэйшых навучальных устаноў. 25 кастрычніка 1919 г. Магілёўскі ІНА быў адкрыты з чатырма аддзеламі (без пазашкольнага).

Адкрыццё Магілёўскага настаўніцкага інстытута стала значным крокам у паляпшэнні падрыхтоўкі педагагічных кадраў, важным фактарам у грамадскім жыцці. Адначасова за непрацяглы час настаўніцкія інстытуты былі адкрыты ў Віцебску (1910 г.), Смаленску (1912 г.), Мінску (1914 г.), адчынілі свае дзверы яшчэ 5 настаўніцкіх семінарый. У 1916 г. у Беларусі было 3 настаўніцкія інстытуты (187 навучэнцаў), 9 настаўніцкіх семінарый (каля 1000 навучэнцаў), 7 двухгадовых педагагічных курсаў (288 навучэнцаў). Праблема недахопу кадраў кваліфікаваных настаўнікаў пачала паступова вырашацца. На працягу ўсіх ваенных і рэвалюцыйных цяжкіх і непрадказальных гадоў абмяркоўвалася пытанне аб рэфармаванні настаўніцкіх інстытутаў. Дырэктар У.Тычынін неаднаразова рыхтаваў даклады з аналізам дзейнасці і прапановамі аб будучым настаўніцкіх інстытутаў. У складанай ваенна-палітычнай і эканамічнай сітуацыі Першай сусветнай вайны і расійскай рэвалюцыі кіраўніцтва інстытута рабіла ўсё магчымае, каб інстытут выжыў. Дзякуючы велізарным намаганням, самаадданай працы супрацоўнікаў, інстытут не прыпыніў сваёй дзейнасці ні ў рэвалюцыйных умовах 1917 г., ні пад час нямецкай акупацыі 1918 г. і ў рэшце быў пераўтвораны ў ВНУ.

1. Бондаренко В.А. Могилевский государственный педагогический институт. Краткий очерк истории (к 60-летию основания). – Мн.: «Вышэйшая школа», 1978. – 44 с.
2. Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А. Куляшова: мінулае і сучаснасць. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2003. – 260 с.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. – ф. 2258, воп. 1, спр. 26
4. НГАБ. – ф. 2258, воп. 1, спр. 31
5. НГАБ. – ф. 2258, воп. 1, спр. 33



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова